УДК 821.161.3-14

Г. П. Іванова

Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар

# ДАСЛЕДАВАННЕ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ БАЛАД НА МЯЖЫ XVIII–XIX СТАГОДДЗЯЎ

У дадзеным артыкуле ўвага нададзена даследаванню фальклорных зборнікаў канца XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. У гэтым гістарычным працэсе вылучаны пэўныя перыяды, звязаныя са збіраннем і публікацыяй баладных песень. У дадзены перыяд былі сабраны, апублікаваны шматлікія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы і зроблены першыя спробы класіфікацыі беларускіх народных песень. Адзначаючы каштоўныя здабыткі збіральнікаў-даследчыкаў акрэсленага гісторыяграфічнага перыяду ў вывучэнні баладнай творчасці, аўтар падкрэслівае, што гэтымі даследчыкамі, як і іх папярэднікамі, балады не былі вылучаны ў асобную групу.

На працягу ўсёй гісторыі збірання фальклору тэксты беларускіх народных балад прыцягвалі да сябе ўвагу шматлікіх збіральнікаў і даследчыкаў, і таму збіранне і публікацыя народных балад адбываліся ў некалькі этапаў: 1) канец XVIII – пачатак XIX стагоддзя; 2) 30-70-я гады XX стагоддзя; 3) 80-я гады XX – пачатак XXI стагоддзя. Першы этап збірання фальклорных матэрыялаў вызначаўся актыўнасцю палявых даследаванняў, што знайшло адлюстраванне ў выданні шматлікіх зборнікаў, у змест якіх уключаны былі і балады. Збіральнікамі гэтага жанру балад з'яўляліся Я. Чачот, К. Тышкевіч, Р. Зянькевіч, П. Гільтэбрант, П. Шэйн, З. Радчанка і іншыя. Значная колькасць баладных тэкстаў была сабрана ўжо ў 30–40-х гг. XIX ст. Балады часткова былі апублікаваны ў зборніках Я. Чачота «Piosnki wiesniacze z nad Niemna» [1], дзе тэксты былі пададзены ў перакладзе на польскую мову, а ў апошнім (шостым) выпуску прадстаўлены ў аўтэнтычных запісах. У зборніку прадстаўлены пазаабрадавыя песні, сярод якіх сустракаюцца народныя балады, якія змяшчаюць міфалагічныя матывы, а таксама тэксты навелістычных і гульнёва-карагодных балад. Заслугоўваюць увагі фальклорна-этнаграфічныя працы К. Тышкевіча «Описание Борисовского уезда..» [2] і «Вилия и её берега» [3], у якіх збіральнікам былі апублікаваны тэксты міфалагічных, гульнёва-карагодных і навелістычных балад. Адзначым, што аўтар не ставіў на мэце класіфікаваць прапанаваныя песні. Невыпадкова ў раздзеле «Каляды», які змешчаны ў працы «Описание Борисовского уезда..», сустракаецца шэраг цікавых сюжэтаў міфалагічных балад. Тэксты балад, уключаныя ў зборнік «Народные белорусские песни» [4] Елізаветы Паўлоўскай (Е. П.), былі сабраны ў Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні. Даследчыцу неаднойчы крытыкавалі за няўважлівае стаўленне да мовы тэкставых запісаў, аднак у сваім зборніку Е.П. адзначыла, што «ні ў чым не змяніла песні, пісала так, як чула, але не захавала асаблівасцей беларускай гаворкі, і прыняла рускі алфавіт» [4, с. 3]. Адзначым, што ў зборніку балады не вылучаны ў асобны раздзел, хоць адзінкавыя тэксты трапляюцца ў раздзеле «Думкі», значна больш іх прадстаўлена ў раздзеле «Повествовательные». «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае» [5], які належыць П. Гільтэбранту, налічвае 300 народных песень, якія былі сабраны даследчыкам на тэрыторыі Гродзенскай, затым Віленскай і часткова Мінскай губернях. Аўтар спрабуе даказаць падабенства беларускіх песень да рускіх. У зборніку Фольклористика 252 П. Гільтэбрант не вылучае балады ў асобны раздзел, напрыклад, побач з сюжэтамі міфалагічных балад сустракаюцца і сюжэты навелістычных балад. Навуковую каштоўнасць уяўляе раздзел «Семейныя песни» ў зборніку «Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края» [6] М. Дзмітрыева, дзе змешчаны міфалагічныя балады з рознымі сюжэтамі: напрыклад, міфалагічныя балады з сюжэтамі «дачка-птушка», «удава і сыны-карабельнікі», а ў раздзеле «Песни с некоторых рассказов» мае месца тэкст міфалагічнай балады. У зборніку «Белорусские песни с подробными объяснениями» [7] П. Бяссонава балады змешчаны ў раздзеле абрадавай паэзіі. У падраздзеле «Купальские песни» сустракаецца тэкст міфалагічнай балады з сюжэтам «брат забівае сястру». Зборнік І. Насовіча складаецца з прадмовы, у якой аўтар характарызуе

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускія песні. Заўважым, што месца запісу песень збіральнікам не ўказана. У працы І. Насовіча «Белорусские песни» [8] тэксты балад можна сустрэць у раздзелах «Песни весѐлого содержания», «Песни разных семейных перемен, невзгод и прочего» і «Дополнение». Адзначым, што ў раздзеле «Песни весѐлого содержания» ўяўляюць цікавасць сюжэты міфалагічных і навелістычных балад. У зборніку «Белорусские народные песни» [9] П. Шэйна зроблена спроба класіфікацыі песень па асобных раздзелах, але балады не былі вылучаны ў асобны раздзел, і таму сюжэты баладных песень трапляюцца ў розных раздзелах, міфалагічныя балады з сюжэтам «браткі», якія размешчаны ў падраздзеле «Купальские песни» (раздзел «Календарные песни»). Упершыню збіральнікам у падраздзеле «Жнивные песни» змешчана балада з сюжэтам «ваўкіняньκі», якая адносіцца да групы балад казачных і легендарных. У кнізе «По Минской губернии» [10] М. Янчук падзяліў песні на сямейна-абрадавыя і каляндарна-абрадавыя. Аўтар уключыў тыя тэксты народных песень, якія былі запісаны пераважна ім у Мінскай губерні, але 22 песні былі дасланы іншымі збіральнікамі. У раздзеле «Рознае» прадстаўлены міфалагічныя балады, а таксама тэкст навелістычнай балады. З. Радчанка у кнізе «Гомельские народные песни» [11] размясціла 676 народных песень адной воласці Гомельскага павета. Матэрыял быў сабраны на радзіме яе маці, жыццѐ ў вѐсцы дало ѐй магчымасць пазнаѐміцца з бытам, норавамі, звычаямі, павер‘ямі і песнямі мясцовых жыхароў. Аўтар прапанавала класіфікацыю песенных 253 тэкстаў у залежнасці ад часу іх выканання і не настойвала на самабытнасці гэтых песень. Варта адзначыць, што ў раздзелах «Весновые песни» і «Простые песни» сустракаюцца тэксты традыцыйных міфалагічных балад, а таксама навелістычныя балады. У кнізе «Пинчуки» [12] Д. Булгакоўскі апублікаваў 257 песень, з характарыстыкай і заўвагамі пра асаблівасці іх мовы. Гэты зборнік стаў вынікам збіральніцкай працы святара ў Пінскім павеце Мінскай губерні ў 70-я гг. Аўтар адзначыў, што сабраны матэрыял вельмі разнастайны па мове, а што абумоўлена адметнымі мясцовымі асаблівасцямі. Збіральнікам не адзначана месца запісаў песень і не захаваны прынцыпы іх навуковай класіфікацыі. Надзвычай каштоўнымі з‘яўляюцца раздзелы «Любовные песни» і «Семейные песни», у якіх змешчаны тэксты міфалагічных балад, дзе, напрыклад, у межах аднаго варыянта балады спалучаны два сюжэты «сястра і браты-разбойнікі» і «маці атручвае сына і нявестку». У адрозненне ад папярэдніх выданняў, кніга Д. Булгакоўскага завяршаецца раздзелам «Общие замечания», дзе аўтар звяртае ўвагу на мову песень, асаблівасці фанетыкі і граматыкі, надае ўпершыню ўвагу аналізу вобразных сродкаў у песенных тэкстах. М. Доўнар-Запольскі ў працы «Песни пинчуков» [13] прадставіў тэксты песень, якія былі сабраны падчас яго летніх падарожжаў па Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах у 1890 г., а таксама па Барысаўскім, Ігуменскім і Мінскім паветах у 1892 г. Аўтар, размясціўшы песні па раздзелах, балады прадставіў ў вялікім раздзеле пад назвай «Лирические песни». Сярод веснавых, летніх, восеньскіх песень сустракаюцца тэксты міфалагічных, гульнѐва-карагодных і навелістычных балад. Вялікую цікавасць уяўляе падраздзел песень «Женские», якія сваім сюжэтным напаўненнем адлюстроўваюць цяжкую долю жанчыны, і таму ў гэтым падраздзеле змешчаны міфалагічныя балады з сюжэтамі, прысвечанымі цяжкаму лѐсу маладой жанчыны ў новай сям‘і. Е. Раманаў у прадмове да кнігі «Белорусский сборник» [14] адзначыў, што прапанаваная ім класіфікацыя песень «больш ці менш вольная». Аўтар шкадуе, што вельмі позна прыйшоў да меркавання аб неабходнасці размежавання песень па часе іх выканання: «Такое цыклавое іх размеркаванне ўстаноўлена самім народам і ім жа ахоўвалася на працягу шматлікіх вякоў» [14, с. 9]. М. Косіч у прадмове да кнігі «Литвины-белорусы Черниговской губернии их быт и песни» [15] змясціла каментарый да песень і палічыла неабходным раскласіфікаваць іх па порах года, часе выканання. Аднак у раздзеле «На жниво» змешчаны цікавы варыянт Фольклористика 254 міфалагічнай балады з сюжэтам «свякруха заклінае нявестку ў быліну» («Ажаніла ўдоўка»). Збіральніку У. Дабравольскаму належыць багаты збор беларускіх і рускіх народных песень, якіх налічваецца 1500 адзінак, апублікаваных ў яго чатырохтомнай працы «Смоленский этнографический сборник» [16]. Аўтар у пачатку свайго зборніка папярэджвае, што тэксты песень неабходна было скараціць, і адзначае, што таксама крыху была зменена графіка песень. Пэўныя цяжкасці былі выкліканы з размяшчэннем і класіфікацыяй песень, і таму

невыпадкова былі аб'яднаны ў адну групу - разбойніцкія і баладныя песні, сярод якіх трапляюцца міфалагічныя балады з сюжэтамі: «маці атручвае сына і нявестку», «свякруха заклінае нявестку ў рабіну», «сястра і браты-разбойнікі», а таксама змешчаны тэкст навелістычнай балады з сюжэтам «заморскае зелле». У зборніку «Белорусские народные песни» [17] А. Розенфельда сустракаецца шэраг твораў, сярод якіх вылучаюцца міфалагічныя і гульнѐва-карагодныя ліра-эпічныя тэксты. Аўтар размясціў песенны матэрыял па месцы яго запісу. У выданні «Белорусские народные песни» [18] С. Малевіча прадстаўлены тэксты беларускіх народных твораў, якія былі сабраны ў Слуцкім павеце Мінскай губерні. Даследчык вылучыў у асобны раздзел любоўныя, сямейныя, салдацкія, маладзецкія песні. Тэксты ліра-эпічных песень пераважна сустракаюцца ў двух вышэйназваных раздзелах («любоўныя» і «сямейныя»). Адзначым што найбольш шырока прадстаўлены сюжэты міфалагічных балад і зрэдку сустракаюцца тэксты навелістычных балад. Такім чынам, даследаваны гістарычны перыяд (канец XVIII ст. – пачатку XIX ст.) у вывучэнні народнай спадчыны вызначаецца тым, што былі сабраны, апублікаваны шматлікія фальклорнаэтнаграфічныя матэрыялы і зроблены першыя спробы класіфікацыі беларускіх народных песень. Кожным з даследчыкаў былі выбраны адметныя крытэрыі размяшчэння песень па раздзелах і прапанавана іх уласная класіфікацыя: па часе выканання (З. Радчанка, М. Косіч), па змесце песень (М. Дзмітрыеў), падзел на сямейна-абрадавыя і каляндарна-абрадавыя песні (П. Шэйн, У. Дабравольскі). Спіс літаратуры 1 Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / уклад., сістэм. тэкстаў і камент. В. І. Скідана і А. М. Хрушчовай, уступ. арт. Т. В. Валодзінай, рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларуская навука, 1997. – 342 с. 255 2 Тышкевіч, К. П. Wilija i jej brzegi / Konstantin Hr. Tyszkiewicz. – Pakartotine 1871 m. knygos orginalo laida. – Vilnius : Afkula, 2008. – 362 с. 3 Тышкевіч, К. П. Opisanie powiatu borysowskiego pod wzgledem statystycznym, gegnostycznym, historycznym, gospodarczym, przemyslowohandlowym I lekarskim / Konstantin Hr. Tyszkiewicz. H – Wilno: Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. – 446 с. 4 Народные белорусские песни / Сост. Е.П. – СПб. , 1853. – 143 с. 5 Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае / сост., авт. предисл. с. III-CV, П. Гильтебрант. Вып. 1: Песни, пословицы, загадки Гродненской, Виленской и отчасти Минской губерний. – Вильно: Тип. Р. М. Ромма, 1866. – 294 с. 6 Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян СевероЗападного края / М. А. Дмитриев. - Санкт-Петербург: Альфарет, 2016. – 264 с. 7 Бессонов, П. А. Белорусские песни, с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П. П. Бессонов. – М.: Издерж. Общества любителей российской словесности, 1871. – 176 с. 8 Белорусские песни, собранные И. И. Носовичем. – СПб. , 1873. – 235 с. 9 Шейн, П. В. Белорусские народные песни / П. В. Шейн. – СанктПетербург: Тип. Майкова, 1874. – 566 с. 10 Янчук, Н. А. По Минской губернии (заметки из поездки в 1886 году) / Н. Янчук. – Москва: Тип. А. Левенскон и К°, 1889. – 130 с. 11 Гомельские народные песни (белорусские и малорусские). Записаны в Дятловицкой волости Гомельского уезда Могилѐвской губ. Зинаидой Радченко, с приложением 83 местных пословиц, «Записки имп. Русского географического общества по отделению этнографии». – СПб.: Тип. В. Безобразова и К°, 1888. - 321 с. 12 Булгаковский, Д. Пинчуки. Этнографический сб. / Д. Булгаковский. – Тип. В. Бурбразова и К., 1890. – 212 с. 13 Довнар-Запольский, М. Песни пинчуков / М. Довнар-Запольский. – Киев: Тип. Завадского, 1895. – 203 с. 14 Романов, Е. Белорусский сборник. Вып. 1-2. Песни, пословицы, загадки / Е. Романов. – Киев: Типография С.В. Кульженко, 1885. - 468 с. 15 Косичъ, М. Литвины-Бѣлорусы Черниговской губерніи, ихъ быт и пѣсни / М. Косич. – СПб: Тип . В, П. Мещерскаго, 1902. – 128 с. 16 Добровольский, В. Н. Смоленский этнографический сборник: в 4 т. / В. Н. Добровольский. Т. 4. – М. : Типография А. В. Васильева, 1903. - 780 с. 17 Белорусские народные песни : сб. Отд-ния рус. яз. и словесности Имп. акад. наук / сост. А. Розенфельд. – СПб.: Тип. Имп. акад. наук, 1904. – 92 с. Фольклористика 256 18 Белорусские народные песни : сб. Отд-ния рус. яз. и словесности Имп. акад. наук / собрал С. Малевич. – СПб.: Тип. Имп. акад. наук, 1907. – 196 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ